# Змест

Раздзел 1. Акадэмія доктара Клякса і іншыя казкі ........ 5
Раздзел 2. Незвычайная гісторыя Мацея ........ 15
Раздзел 3. Дзівацтвы доктара Клякса ........ 37
Раздзел 4. Заняткі ў Акадэміі ........ 75
Раздзел 5. Кухня доктара Клякса ........ 89
Раздзел 6. Мая вялікая прыгода ........ 129
Раздзел 7. Фабрыка дзірак і дзірачак ........ 187
Раздзел 8. Сон пра сем шклянак ........ 199
Раздзел 9. Анатоль і Астап ........ 223
Раздзел 10. Гісторыя пра месяцовых людзей ........ 235
Раздзел 11. Таямніцы доктара Клякса ........ 255
Раздзел 12. Развітанне з казкай ........ 271

# Раздзел 1

## Акадэмія доктара Клякса і іншыя казкі

Мяне завуць Адам Нязгодка, мне дванаццаць гадоў, і ўжо амаль паўгода я вучуся ў Акадэміі доктара Клякса. Дома ў мяне ніколі нічога не выходзіла. Я заўсёды спазняўся ў школу, ніколі не паспяваў зрабіць хатняе заданне, і рукі ў мяне былі дзіравыя. Усё ў мяне падала на падлогу і разбівалася, а шклянкі і сподкі ад аднаго майго выгляду лопаліся і разляталіся на дробныя аскепкі, я нават не паспяваў да іх дакрануцца. Я цярпець не мог крупнік і тушаную моркву і штодзень атрымліваў на абед акурат крупнік і тушаную моркву, бо гэта карысная і здаровая ежа. Калі ж да ўсяго ліха я заліў атрамантам порткі, абрус і новы матчын касцюм, бацькі надумалі адправіць мяне па навуку і выхаванне да доктара Клякса. Ягоная Акадэмія месціцца ў самым канцы Шакаладнай вуліцы і займае вялікі чатырохпавярховы будынак, складзены з каляровых цаглінак. На чацвёртым паверсе захоўваюцца запаветныя

і нікому не вядомыя таямніцы доктара Клякса. Ніхто не мае права туды заходзіць, а нават калі б некаму і захацелася ўвайсці, ён бы не змог, бо прыступкі вядуць толькі да трэцяга паверха, а сам доктар Клякс трапляе да сваіх таямніц праз комін. На першым паверсе размешчаны кабінеты, у якіх праходзяць заняткі, на другім — спальні і агульная сталоўка, урэшце, на трэцім жыве доктар Клякс з Мацеем, але гэта толькі ў адным пакоі, а ўсе астатнія пазамыканыя на ключ.

Доктар Клякс прымае ў сваю Акадэмію толькі хлопцаў з імёнамі на літару А, бо, як ён кажа, не збіраецца засмечваць сабе галаву ўсімі літарамі алфавіта. Таму ў Акадэміі чацвёра Адамаў, пяцёра Аляксандраў, трое Андрэяў, трое Арцёмаў, шасцёра Антонаў, адзін Артур, адзін Аляксей і адзін Альберт, то-бок усяго дваццаць чатыры вучні. Доктара Клякса завуць Арсень, і таму з усёй Акадэміі адзін толькі Мацей не пачынаецца на А. Зрэшты, Мацей зусім і не вучань. Гэта вучоны шпак доктара Клякса. Мацей выдатна гаворыць, але вымаўляе толькі канцы слоў, зусім не зважаючы на іх пачаткі. Калі, напрыклад, Мацей падыходзіць да тэлефона, звычайна чуваць:

— Таю, та эмія ктара лякса.

Гэта значыць:

— Вітаю, гэта Акадэмія доктара Клякса.

## Раздзел 2

### Незвычайная гісторыя Мацея

Насамрэч я не птушка — я прынц. У дзяцінстве мне расказвалі шмат казак пра людзей, ператвораных у птушак ці жывёл, але я ніколі не верыў у іх праўдзівасць.

Ды маё ўласнае жыццё склалася акурат так, як апісвалася ў гэтых казках.

Я нарадзіўся ў каралеўскай сям'і і быў адзіным сынам і спадкаемцам трона вялікага і магутнага ўладара. Я жыў у палацы, аздобленым мармурам і золатам, хадзіў па персідскіх дыванах, кожны мой капрыз адразу ж выконвалі паслужлівыя міністры і прыдворныя, кожная мая сляза была падлічана, кожная ўсмешка — запісана ў адмысловую кнігу прынцавых усмешак, а сёння я — шпак, які адчувае сябе чужым як між птушак, так і між людзей.

Мой бацька быў каралём і валадарыў над многімі краінамі і народамі. Мільёны людзей трымцелі, толькі пачуўшы ягонае імя. Незлічоныя скарбы і палацы, залатыя кароны

і скіпетры, каштоўныя камяні, багацці, пра якія ніхто і не марыць, — усё гэта належала майму бацьку.

Маці таксама была каралеўскага роду і славілася прыгажосцю на ўсім белым свеце і на ўсім чорным моры. У мяне было чатыры сястры, і ўсе яны выйшлі замуж за каралёў: адна — за іспанскага, другая — за італьянскага, трэцяя — за партугальскага, чацвёртая — за галандскага.

Каралеўскія караблі валадарылі на чатырох морах, а войска было такое вялізнае і магутнае, што ў маёй краіны не было ворагаў і ўсе ўладары свету марылі пра сяброўства і прыхільнасць майго бацькі.

З самых малых гадоў я захапляўся паляваннем і коннай яздой. Мая ўласная стайня налічвала сто дваццаць арабскіх і англійскіх скакуноў, а таксама сорак восем стэпавых мустангаў.

У маёй збройні было шмат паляўнічых стрэльбаў, зробленых выбітнымі майстрамі і дастасаваных да майго росту, даўжыні пляча і да майго вока.

Калі мне споўнілася восем, мой бацька, кароль, даручыў маё выхаванне дванаццаці слынным вучоным і загадаў ім навучыць мяне ўсяму таму, што яны самі ведаюць і ўмеюць.

Я добра вучыўся, але мая неадольная жарсць да сядла і стрэльбы настолькі распальвала розум і душу, што я ўжо не мог думаць ні пра што іншае.









